LIETUVOS RESPUBLIKOS ŠVIETIMO IR MOKSLO MINISTERIJA
NACIONALINIS EGZAMINŲ CENTRAS



(miestas / rajonas, mokykla)

__________ klasės mokinio (-ės) ____________________
(vardas ir pavardė)

# GIMTOJI KALBA (BALTARUSIŲ)

2014 m. mokyklinio brandos egzamino užduotis

Pagrindinė sesija

**2014 m. birželio 6 d.** **Trukmė – 4 val. (240 min.)**

**NURODYMAI**

- Pasitikrinkite, ar egzamino užduočių sąsiuvinyje nėra tuščių lapų ar kito aiškiai matomo spausdinimo broko. Pastebėję praneškite egzamino vykdytojui.
- Antraštiniame lape užrašykite savo vardą ir pavardę, rajoną / miestą, mokyklą ir klasę (grupę).
- Vertinami tik tie atsakymai, kurie parašyti mėlynai rašančiu rašikliu. Koregavimo priemonėmis naudotis negalima. Neaiškiai parašyti, pribraukyti atsakymai vertinami 0 taškų.
- Atlikdami teksto suvokimo užduotis (II egzamino dalis), į klausimus atsakykite glaustai ir aiškiai. Jūsų atsakymai turi tilpti paliktose eilutėse.
- III egzamino dalyje pateiktos trys rašinio temos ir du tekstai interpretacijai. Įdėmiai juos perskaitykite, pasirinkite ir parašykite vieną rašinį arba vieną teksto interpretaciją.
- Turite parašyti 250–400 žodžių (A4 formato 1–2 puslapiai) tekstą. Vertinant bus atsižvelgiama ir į darbo apimtį. Švarraštyje suskaičiuokite žodžius. Paraštėje **nurodykite 250 žodžių ribą**.
- Jeigu pirmiausia rašote juodraštyje, pasilikite pakankamai laiko darbui perrašyti į švarraštį. **Juodraštis nebus tikrinamas.**
- 

Linkime sėkmės!

**EGZAMINO VERTINIMAS TAŠKAIS**

| **II dalis (teksto suvokimas)** | **III dalis (rašinys arba interpretacija)** | **TAŠKŲ SUMA** |
|---|---|---|
| 30 taškų | 40 taškų | 70 taškų |
| | | |

Vertinimo komisija: ____________________
(parašas, vardas ir pavardė)

____________________
(parašas, vardas ir pavardė)

____________________
(parašas, vardas ir pavardė)

© Nacionalinis egzaminų centras, 2014 

# II egzamino dalis

# TEKSTO SUVOKIMAS

Прачытайце верш А. Куляшова і выканайце заданні 1–16.

**Бывай...**

Бывай, абуджаная сэрцам, дарагая.
Чаму так горка, не магу я зразумець.
Шкада заранкі мне, што ў небе дагарае
На ўсходзе дня майго, якому ружавець.

Ці помніш першае нясмелае прызнанне?..
Над намі жаўранкам звінеў і плакаў май.
Назаўтра золкае, туманнае світанне,
Суровы позірк твой і мой нямы адчай.

Пайшла ты, любая, пад гоман жоўтых сосен,
Пайшла, маўклівая, пад хваль жытнёвых шум,
Туды, дзе гойдала зялёнае калоссе
На сцежках ростані мой адзінокі сум.

Пайшла за ціхія, далёкія прасторы
Світальнай зоркай ты, што гасне ў сіняве.
Душы пакрыўджанай гарачыя дакоры
Слязой халоднаю застылі на траве.

Пайшла, пакінуўшы мне золкі і туманы,
Палынны жаль смугой ахутаных дарог,
Каб я хвілінны боль і горыч гэтай раны
Гадамі ў сэрцы заглушыць сваім не мог.

Пайшла, ніколі ўжо не вернешся, Алеся.
Бывай, смуглявая, каханая, бывай.
Стаю на ростанях былых, а з паднябесся
Самотным жаўранкам звініць і плача май.

Бывай, абуджаная ў сэрцы, дарагая.
Твой светлы вобраз панясу я па жыцці.
На ўсходзе дня майго заранка дагарае,
Каб позна вечарам на захадзе ўзысці.

*1928*

***Заданні да тэксту*** *(30 балаў)*

Балы: I II III

**1.** Вызначце тэму верша.

______________________________

*(1 бал)*

**2.** Да якога віду лірыкі адносіцца гэты верш? *Правільны адказ абвядзіце.*

**А** Грамадзянская
**Б** Інтымная
**В** Пейзажная
**Г** Філасофская

*(1 бал)*

**3.** Адзначце дзве асаблівасці, уласцівыя гэтаму віду лірыкі:

**А** Лагічнасць, доказнасць
**Б** Пяшчотнасць, шчырасць выказвання асабістых перажыванняў
**В** Разважлівасць
**Г** Летуценнасць
**Д** Павышаная ўсхваляванасць

*(1 бал)*

**4.** Якім вам уяўляецца лірычны суб’ект верша?

______________________________

______________________________

*(2 балы)*

**5.** Да каго звяртаецца ў вершы лірычны суб’ект?

______________________________

______________________________

*(1 бал)*

**6.** Выпішыце з тэксту верша **тры** словы, якія сведчаць пра адносіны лірычнага героя да дзяўчыны.

__________ __________ __________

*(1 бал)*

**7.** Якія пачуцці перадаюцца ў вершы?

______________________________

______________________________

*(2 балы)*

**8.** Чаму гэты верш можна назваць элегіяй?

______________________________

______________________________

______________________________

______________________________

*(2 балы)*

| Сума балаў за заданні 1–8 *(макс. 11 балаў)* | | | |
|---|---|---|---|

| | *Балы* | | |
|---|---|---|---|
| | *I* | *II* | *III* |

**9.** Верш прасякнуты светлым і адначасова сумным настроем. Выпішыце з тэксту па **3** словы (словазлучэнні), якія даказваюць гэта.

*Светлы настрой:*

______________________________

______________________________

*Сумны настрой:*

______________________________

______________________________

*(2 балы)* ___ ___ ___

**10.** Растлумачце ролю шматкроп'я ў сказе *Ці помніш першае нясмелае прызнанне?..*

______________________________

______________________________

*(2 балы)* ___ ___ ___

**11.** Першая і апошняя строфы верша пачынаюцца са слова ***Бывай.*** Растлумачце ролю такой кампазіцыі верша.

______________________________

______________________________

*(2 балы)* ___ ___ ___

**12.** ***Анафара*** *(ад грэч. anaphora – наўтарэнне) – стылістычны прыём, які заключаецца ў паўтарэнні фраз, слоў ці гукаў на пачатку суседніх радкоў, строф і інш.*

Прывядзіце прыклад анафары ў вершы і растлумачце яе мастацкую ролю.

*Анафара –* ______________________________

______________________________

______________________________

______________________________

*(3 балы)* ___ ___ ___

**13.** Падбярыце **два** эпітэты да слова *каханне.*

______________________________ ______________________________

*(1 бал)* ___ ___ ___

**14.** Растлумачце (па ніжэй прыведзенаму ўзору) значэнне наступных выразаў, падабраўшы да кожнага з іх неабходнае слова(-ы).

*на ўсходзе дня майго* – юнацтва

*гасне ў сіняве* – ______________________________

*слязою халоднаю* – ______________________________

*твой... вобраз панясу я па жыцці* – ______________________________

*(3 балы)* ___ ___ ___

| Сума балаў за заданні 9–14 *(макс. 13 балаў )* | | | |
|---|---|---|---|

| | *Балы* | | |
|---|---|---|---|
| | *I* | *II* | *III* |

**15.** Падбярыце аднакарэнныя словы розных часцін мовы да прыметніка *каханая.*

Назоўнік – ____________________________

Дзеяслоў – ____________________________

Прыслоўе – ____________________________

Дзеепрыслоўе – ____________________________

*(2 балы)*

**16.** Растлумачце розніцу ў значэнні слоў *каханне* і *любоў*. Прывядзіце па аднаму прыкладу словазлучэнняў, якія б ілюстравалі гэту розніцу.

*Каханне* – ________________________________________________________

________________________________________________________________

________________________________________________________________

*Любоў* – ________________________________________________________

________________________________________________________________

________________________________________________________________

*(4 балы)*

| Сума балаў за заданні 15–16 *(макс. 6 балаў)* | | | |
|---|---|---|---|

## Чарнавік

АЦЭНКА ВЫКАНАННЯ ТЭСТА

| | | Члены комиссии | | |
|---|---|---|---|---|
| | Макс. сумма | 1 | 2 | 3 |
| Сума балаў за заданні 1–8 | 11 | | | |
| Сума балаў за заданні 9–14 | 13 | | | |
| Сума балаў за заданні 15–16 | 6 | | | |
| Сума балаў | 30 | | | |
| Акругленая сума балаў | 30 | | | |

## III egzamino dalis

# TEKSTO KŪRIMAS

З прапанаваных тэм сачыненняў і тэкстаў для інтэрпрэтацыі Вы павінны выбраць адну тэму альбо адзін тэкст і напісаць працу. Праца павінна быць аб'ёмам прыблізна 2 старонкі фармата А4 (250–400 слоў). У чыставіку ад пачатку працы адлічыце 250 слоў, пазначце месца, дзе яны заканчваюцца, і запішыце гэтую колькасць на палях.

## ТЭМЫ САЧЫНЕННЯЎ

1. "Той і шчаслівы, хто зведаў каханне..."(П. Панчанка). Тэма кахання ў творчасці беларускіх паэтаў.

2. Беларуская вёска ў часы калектывізацыі (па творах К. Чорнага, М. Зарэцкага, І. Мележа, В. Быкава і інш.).

3. Тэма нацыянальнай і чалавечай годнасці народа, яго свабоды і шчасця ў творчасці беларускіх пісьменнікаў пачатку XX стагоддзя (па творах Я. Купалы, Я. Коласа, М. Гарэцкага і інш.).

## ТЭКСТЫ ДЛЯ ІНТЭРПРЭТАЦЫІ

4. **А. Русецкі**

Мне разгадаць бы вечнасці сакрэт –
адмоўнай сіметрычнасці прычыну:
святло і цемра,
свет і антысвет,
хлусня і праўда часу,
плюс і мінус.
Паўторана, нібы люстраным шклом,
зусім наадварот палова свету:
усход і захад,
і дабро і зло,
нянавісць і любоў,
зіма і лета.
То сціхне, то ўзгарыцца ў галаве
сусветнага адзінства супярэчнасць,
але ў сабе шануе чалавек
святло,
дабро,
любоў
ды праўду
вечна.

## 5. Я. Брыль

Найпрыгажэйшы бывае чалавек тады, калі ён не ведае пра гэта, калі ён не бачыць самога сябе. На жаль, нават часцей за ўсё тады, калі яго не бачыць ніхто.

Старога Вячэру ў лодцы бачыла цяпер толькі пяцігадовая Ганначка. Поўненькая, светленькая, любіміца сям'і, яна круцілася, як сініца, на сярэдняй лаўцы, перад сваім дзядулем, глядзела на яго, зусім не думаючы, што любуецца, і то сама шчабятала, то слухала, не бядуючы, што яшчэ няшмат разумее.

А дзед быў прыгожы.

Без шапкі, у шэрай, як ралля, расхрыстанай на сухіх, загарэлых грудзях кашулі. Упёршыся худымі і пругкімі, як смаляныя галіны, нагамі ў рабрыну вялікай лодкі, "кароль вугроў" паволі і няспынна разгойдваўся ўперад-назад, рытмічна ўзмахваючы цяжкімі вёсламі. З вельмі дакладнай і неабходнай для справы скупасцю заграбаў ён ціхую празрыстую ваду. Так лёгка і хораша, спраўна і спорна ідуць у пракосе сапраўдныя касцы. Белы маршчыністы лоб над загарэлымі скуламі шчодра акроплены потам. Сівыя валасы, хоць і прычасаныя перад ад'ездам у людзі, як толькі ён зняў кепку, зноў растрэсліся, прынялі свой звычайны, сціпла кучаравы беспарадак.

Прыгожая была гэта шэрая, вельмі жыццёвая, натуральная прастата, гэтая яшчэ ўсё не растрачаная сіла, якую і не высушылі, і не прыглушылі дзевяць дзесяткаў больш катаржных, чым радасных, гадоў. Прыгожы быў позірк светла-блакітных вачэй пад густымі, сівымі брывамі, вачэй адкрытых і чыстых, як само бясхмарнае неба, паўторанае ў крынічным люстры бяскрайняга возера. Прыгожы быў, урэшце, увесь гэты звычайны, будзённы малюнак: вялікая чорная лодка на вадзяной пустыні, у лодцы – шэры дзед і светленькая ўнучка, а за кармой, на буксіры, – доўгае сасновае бервяно і яшчэ даўжэйшы трохкутнік растрывожанай вады.

ЧАРНАВІК

*Працяг чарнавіка на 10-й старонцы*

# ЧЫСТАВІК

| | I | II | III |
| --- | --- | --- | --- |

***Працяг чыставіка на 11-й старонцы***

*Працяг чарнавіка*

*Працяг чарнавіка на 12-й старонцы*

***Працяг чыставіка***

*I* *II* *III*

***Працяг чыставіка на 13-й старонцы***

*Працяг чарнавіка*

***Працяг чыставіка***

*I II III*

| III dalis (teksto kūrimas) | | | | Сума балаў |
|---|---|---|---|---|
| **Змест** | **Структура тэксту** | **Стыль мовы** | **Грамат-насць** | |
| 20 балаў | 4 балы | 4 балы. | 12 балаў | 40 балаў |
| | | | | |

ЧАРНАВІК